Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

№ 295 (364)
АЎТОРАК 24 СНЕЖНЯ 1940 г.

Цана 10 капеек.

Пленум ЦК КП(б) Беларусі

20—22 снежня 1940 года адбыўся чарговы пленум ЦК КП(б) Беларусі. Першым пытаннем пленум заслухаў і абмеркаваў даклад сакратара Мінскага гарадскога камітэта партыі тав. Власава аб кіраўніцтве прамысловасцю. Дакладчык расказаў аб той рабоце, якую прарабілі большэвікі Мінска па рэалізацыі рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б). На радзе прадпрыемстваў горада наведзен парадак, вырасла прадукцыйнасць працы, палепшана якасць і значна павялічыўся выпуск прадукцыі. 22 прадпрыемствы да 15 снежня выканалі свае гадавыя планы.

Аднак асобныя прадпрыемствы нездавальняюча выконваюць планы.

Многія кіраўнікі мінскіх прадпрыемстваў — дырэктары і сакратары партыйных арганізацый не ўнікаюць глыбока ў эканоміку і фінансавы стан прадпрыемстваў. Удзяляючы ўвагу выкананню колькасных паказчыкаў плана, яны ўпускаюць з свайго поля зроку такія важныя пытанні, як прадукцыйнасць працы, зніжэнне сабекошту, якасць прадукцыі і т. д.

Гаворачы аб кіраўніцтве прамысловасцю з боку гаркома партыі, дакладчык адзначыў, што ў гаркоме кантроль за выкананнем сваіх рашэнняў пастаўлен яшчэ слаба.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Народны камісар мясцовай прамысловасці БССР тав. Каган паведаміў, што за 10 месяцаў бягучага года ва ўсходніх абласцях БССР уведзена ў строй 79 новых прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, а ў заходніх абласцях арганізавана 105 прадпрыемстваў. Значна расшырана мясцовая прамысловасць г. Мінска. Тут пабудаван і пушчан радыёзавод, а таксама рад майстэрань, выпрацоўваючых прадметы шырокага спажывання. У раёнах створана 200 майстэрань па выпрацоўцы тавараў шырокага спажывання.

Сакратар Аршанскага гаркома КП(б)Б тав. Камісараў адзначыў, што гарадская прамысловасць за 11 месяцаў поўнасцю выканала план, пры чым некаторыя заводы, як, напрыклад, завод «Чырвоны барэц», Аршанскі ільнокамбінат, значна павялічылі выпуск прадукцыі.

Сакратар Беластоцкага гаркома партыі тав. Раманаў гаварыў аб росквіце социялістычнай прамысловасці ў заходніх абласцях рэспублікі. У Беластоку зараз створаны буйныя фабрыкі і камбінаты, аснашчоныя перадавой тэхнікай. Калі ў панскай Польшчы ў лепшыя годы прамысловасць горада Беластока выпускала 5 мільёнаў метраў тканіны, то тэкстыльшчыкі совецкага Беластока ў 1940 годзе далі краіне каля 13 мільёнаў метраў тканіны. Такі-ж рост маецца па лёгкай, лясной і іншых галінах прамысловасці.

Сакратар Заблудаўскага райкома партыі (Беластоцкая вобласць) тав. Марголін рэзка крытыкаваў рэспубліканскія наркаматы мясцовай і лёгкай прамысловасці за недастатковую дапамогу ў справе развіцця прамысловасці ў сельскіх раёнах.

Даклад аб стане грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах БССР зрабіў старшыня Соўнаркома БССР тав. Былінскі.

Выступіўшы ў спрэчках сакратар Брагінскага райкома КП(б)Б тав. Дзюндзікаў гаварыў аб вялікай цякучасці жывёлагадоўчых кадраў. З 1658 работнікаў жывёлагадоўлі раёна 601 чалавек працуе да аднаго года.

Сакратар Палескага абкома КП(б)Б тав. Кудракоў звярнуў увагу на неабходнасць правядзення меліяратыўных работ. Масавая асушка балот дасць новыя ўгоддзі лугоў і пасбішчаў для жывёлы.

З прамовай, падводзячай вынікі пленума, выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка. Першую частку свайго выступлення ён прысвяціў пытанням сельскай гаспадаркі і вынікам сельскагаспадарчага года. У адрозненне ад мінулых год Беларусь заканчвае сельскагаспадарчы год з лепшымі паказчыкамі ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі.

Партыйныя і совецкія арганізацыі і калгаснае сялянства рэспублікі прарабілі вялікую работу па ўздыму і ўмацаванню калгаснай вытворчасці. Праведзены такія важнейшыя мерапрыемствы, як ссяленне ў калгасныя пасёлкі 190 тысяч хутароў, ас[illegible]ч гектараў новых [illegible] дзяржаўны план увядзення правільных севаабаротаў у калгасах. У больш кароткія тэрміны закончан абмалот, выкананы хлебапастаўкі, паднята зябліва. Паспяховае правядзенне ўсіх мерапрыемстваў мае велізарнае значэнне для далейшага ўмацавання калгасаў.

Партыйныя, совецкія і зямельныя органы правялі вялікую работу ў галіне развіцця грамадскай жывёлагадоўлі калгасаў. Значна палепшана пародзістасць жывёлы і павышана яе прадуктыўнасць. За мінуўшы перыяд арганізавана 11.254 жывёлагадоўчых і 5.112 птушкагадоўчых ферм. 91,8 процанта калгасаў рэспублікі маюць па тры фермы, 8 процантаў — па дзве фермы і 0,2 процанта — па адной ферме. Вырасла колькасць перадавых калгасаў, якія ўсебакова развіваюць усе галіны гаспадаркі, атрымліваючы вялікія даходы ад развіцця грамадскай жывёлагадоўлі.

— Аднак у цэлым з развіццём жывёлагадоўлі ў калгасах, — гаворыць тав. Панамарэнка, — справа абстаіць усё яшчэ нездавальняюча. Гэта тлумачыцца тым, што многія партарганізацыі ўсё яшчэ недаацэньваюць жывёлагадоўлю, не ўдзяляюць паўсядзённай увагі і не аказваюць належнай дапамогі калгасам.

Перад партыйнымі, совецкімі арганізацыямі, зямельнымі органамі і кіраўнікамі МТС і калгасаў стаіць рад канкрэтных задач у галіне сельскай гаспадаркі, у тым ліку адна з важнейшых — умацаванне кармавой базы калгасаў, паляпшэнне лугоў і пасбішчаў, павышэнне ўраджаю ўсіх кармавых культур, што з'яўляецца асновай развіцця грамадскай жывёлагадоўлі.

Далей тав. Панамарэнка заастрыў увагу партарганізацый на пытаннях работы прамысловасці і транспарта, на неабходнасці карэннага паляпшэння партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам.

За годы сталінскіх пяцігодак у Беларусі пабудаваны прадпрыемствы, маючыя вялікае народнагаспадарчае значэнне. Мінск стаў буйнейшым прамысловым цэнтрам рэспублікі. У ім сканцэнтрыраваны станкабудаўнічая, скураная і абутковая, швейная, галантарэйная, харчовая і рад іншых галін прамысловасці. Толькі па прадпрыемствах прамысловых наркаматаў валавая прадукцыя 1940 года складае ў нязменных цэнах 1926 — 1927 гг. 307,3 мільёна рублёў.

Тав. Панамарэнка гаворыць аб бліскучых перспектывах развіцця прамысловасці Беларусі, аб новых відах прамысловасці. Асаблівую ўвагу ён удзяляе торфу, як асноўнаму віду паліва ў рэспубліцы. У 1941 годзе ў рэспубліцы будзе будавацца 4 торфабрыкетных заводы. Гэта вельмі зручнае і выгаднае тэхнічнае і бытавое паліва. Выпрабаванне аўтамашын, якія працуюць на паліўным брыкеце, паказала, што гэты від паліва поўнасцю апраўдаў сябе. У далейшым трэба яшчэ шырэй унядраць брыкеты, замяняючы імі бензін.

У Беларусі распрацаваны тэхналагічныя працэсы па атрыманню з торфу эцілавага спірту, бензіну і некаторых іншых хімічных прадуктаў. Так як рэспубліка мае вялікія запасы торфу, то гэта галіна прамысловасці мае перспектывы шырокага развіцця. Торф з'яўляецца сыравінай і для атрымання каштоўных хімічных прадуктаў, патрэбных прамысловасці: фенолу, крэазоту, воску, вуксусна-кіслага кальцыя і натрыя, аміяку, коксу для электродных вуглёў, шпалапрапітачнага масла. Да справы развіцця прамысловасці, выпрацоўваючай хімічныя прадукты з торфу, павінна быць прыкована паўсядзённая ўвага партыйных і совецкіх арганізацый рэспублікі. Зараз праводзяцца работы па вышукванню цэлага раду новых відаў сыравінных рэсурсаў і вопыты па іх прамысловаму асваенню, напрыклад, па атрыманню спірту з адыходаў малочнай прамысловасці, асваенню патрэбных будаўнічых матэрыялаў і т. д.

— Перад намі, — прадаўжае тав. Панамарэнка, —пастаўлена задача—стварыць у рэспубліцы перадавое станкабудаўніцтва. Нашы станкабудаўнічыя заводы павінны асвоіць новыя складаныя тыпы станкоў у патрэбнай для нас колькасці. Гэта з'явіцца каштоўным укладам у цяжкае машынабудаўніцтва Совецкага Саюза.

Партыйныя арганізацыі павінны звярнуць увагу на паляпшэнне стану энергетычнай базы прамысловасці рэспублікі. Трэба па-гаспадарску выкарыстаць электраэнергію, усямерна выкарыстаць мясцовыя рэсурсы, у асаблівасці торф, пры чым неабходна палепшыць тэхналогію вытворчасці і ўстараніць уплыў сезоннасці на здабычы гэтага віда паліва. Трэба забяспечыць здабычу, сушку і вывазку торфу на працягу ўсяго года. У 1941 годзе ў рэспубліцы будзе будавацца некалькі электрастанцый, якія павялічаць энергетычныя рэсурсы народнай гаспадаркі. Але гэта не павінна паслабляць увагі партарганізацый да самай жорсткай эканоміі электраэнергіі.

У рэспубліцы разгортваецца новае прамысловае будаўніцтва. Партарганізацыі абавязаны ўсямерна развіваць прамысловасць мясцовых будматэрыялаў — цэглы, вапны, апрацоўкі каменя, выкарыстанне пяскоў і гліны, якія ёсць у дастатковай колькасці.

У справе хуткага развіцця прамысловасці і новых яе галін маюць велізарнае значэнне народная ініцыятыва, вынаходніцтва, рацыяналізацыя. Партыйныя арганізацыі павінны ўважліва прыслухоўвацца да прапаноў рабочых, інжынераў і тэхнікаў, усебакова іх падтрымліваючы.

Тав. Панамарэнка падкрэсліў, што партарганізацыі абавязаны аказваць усямерную дапамогу рамесленым і чыгуначным вучылішчам і школам ФЗА.

Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня 1940 года стварылі ўсе ўмовы для ўмацавання дысцыпліны, росту прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску прадукцыі і паляпшэння якасці. Трэба і ў далейшым неаслабна змагацца за ажыццяўленне гэтых Указаў.

У заключэнне тав. Панамарэнка заклікаў партарганізацыі Беларусі па-большэвіцку кіраваць прамысловасцю і транспартам, забяспечыць безумоўнае выкананне кожным прадпрыемствам дзяржаўных планаў як па колькасных, так і па якасных паказчыках.

Па абмеркаваных пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум таксама рашыў рад арганізацыйных пытанняў.

У рабоце пленума ЦК КП(б)Б прынялі ўдзел сакратары гаркомаў і райкомаў рэспублікі. **(«Звязда»).**

(З «Праўды» за 23 снежня).



Х. І. Берэк—стаханаўка штопальшчыца 8-га камбіната ў Васількове якая выконвае норму на 200 процантаў. Фота А. Сапіра.

Сустрэнем XVIII партыйную канферэнцыю новымі вытворчымі перамогамі

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** 21 снежня на прадпрыемствах і ва ўстановах адбыліся мітынгі, прысвечаныя вынікам выбараў і рашэнню ЦК ВКП(б) аб скліканні XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі. На мітынгу Граеўскай гумавацясёмачнай фабрыкі з прамовай выступіла стаханаўка тав. Зільберман.

— Наша фабрыка доўгі час не выконвала свайго вытворчага задання,—гаворыць яна.—У перыяд выбарчай кампаніі калектыў нашай фабрыкі дабіўся вялікіх поспехаў. Дзякуючы росту стаханаўскага руху на фабрыцы, мы сталі перавыконваць вытворчыя заданні. За 2 дэкады снежня фабрыка выканала месячнае заданне на 130 процантаў. Абяцаем яшчэ больш павялічыць прадукцыйнасць працы і новымі вытворчымі падарункамі сустрэць адкрыццё усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі рабочыя ўзялі абавязацельствы да адкрыцця канферэнцыі выканаць 2-месячную праграму 1-га квартала 1941 года. Калектыў фабрыкі выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва маскоўскую гумавацясёмачную фабрыку № 16.

Поспехі ў рабоце калектыва скурзавода № 1

Скурзавод № 1 створан з дробных прадпрыемстваў. У ім налічваецца 400 чалавек. Выпуск прадукцыі дасягае штодзённа да 2.200 апоечных адзінак хрому замест раней выпускаўшыхся пры панаванні фабрыканта 250—300 адзінак.

У І-м квартале гэтага года на заводзе нехапала хімікатаў. План быў выканан толькі на 23,3 процанта.

Пасля таго, як мы пачалі рэгулярна атрымліваць хімікаты, наш калектыў з месяца ў месяц пачаў перавыконваць план.

План ІІ-га квартала выканалі на 117 процантаў, ІІІ-га—120,5 процанта, а ў лістападзе — на 143 процанты. 20 снежня мы дабіліся новай перамогі. У гэты дзень завод выканаў гадавы план.

На заводзе сістэматычна расце лік стаханаўцаў. У верасні налічвалася 96 стаханаўцаў, а ў лістападзе — 151. Паасобныя рабочыя паказваюць выдатныя ўзоры стаханаўскай работы. Дубільшчык Малецкі выконвае план на 311 процантаў, Спічко — на 218, Пілецкі—на 220, І. Кац—на 276 процантаў.

З ліку рабочых мы вылучылі на кіруючую работу рад таварышоў. Так, напрыклад, майстрамі вылучаны тт. Прэс, Маліноўскі, Софер, Бартніцкі.

У 1941 годзе намячаем значна пашырыць выпуск прадукцыі. Будзем выпускаць хромавыя і лакіраваныя скураныя тавары. Вялікая работа нам прадстаіць і ў галіне капітальнага будаўніцтва. У гэтым годзе з-за непаваротлівасці абласнога будаўнічага трэста з адпушчаных поўмільёна рублёў на будаўніцтва скарыстана толькі 170 тысяч рублёў. Цяпер становішча выпраўляецца. Фарсіруем будаўніцтва.

Мы прыкладзем усе намаганні, каб адкрыццё XVIII усесаюзнай партыйнай канферэнцыі наш калектыў сустрэў новымі поспехамі.

Е. Уцэхо,
дырэктар скурзавода № 1.

ЛЕСАЗАГАТОЎКІ І ЛЕСАВЫВАЗКА

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ПЛАН ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАВЫВАЗКІ

(Гутарка з старшынёй Гродненскага райвыканкома тав. Пасвенчуком)

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных выклікала вялікі вытворчы ўздым сярод працоўных Гродненскага раёна. Значных поспехаў дабіліся і многія лесарубы і возчыкі. З ліку лесарубаў вылучыліся добрыя майстры высокапрадукцыйнай стаханаўскай працы. Так, напрыклад, жанчына-лесаруб Гродненскага леспрамгаса тав. Вайтукевіч штодзённа выконвае норму выпрацоўкі на 200 процантаў. Такіх-жа паказчыкаў дабіліся і другія стаханаўцы-лесарубы. Выдатных поспехаў дабіліся і паасобныя возчыкі. Добра працуюць возчыкі з вёскі Підовічы Браніслаў Кацінскі, Осіп Семянчук, Янчурэвіч, якія ў два разы перавыконваюць свой план.

Цяпер прымаем усе захады к таму, каб ліквідаваць адставанне на лесазагатоўках і лесавывазцы. Днямі была праведзена нарада па гэтаму пытанню. На сесіях сельскіх Советаў абмяркоўваюцца мерапрыемствы, звязаныя з выкананнем плана лесазагатовак і лесавывазкі. Апошнія дні паказваюць, што выхад падвод у лес значна павялічыўся.

—о—

МАСАВЫ ВЫХАД У ЛЕС

(Гутарка з старшынёй Скідэльскага райвыканкома тав. Бераснёвым)

Насталі рашаючыя дні барацьбы за поўнае выкананне плана чацвертага квартала. Астаўшыйся час да канца года мы скарыстоўваем для завяршэння плана. 21 снежня была праведзена нарада старшынь сельсоветаў і калгасаў па пытанню лесазагатовак і лесавывазкі. Ва ўсіх удзельнікаў нарады была аднадушная думка—скарыстаць гэтыя дні для навярстання ўпушчанага..

23 снежня мы рашылі правесці масавы выхад падвод у лес. Першыя весткі, якія ёсць у райвыканкоме, сведчаць аб тым, што масавы выхад праходзіць здавальняюча. Так, возчыкі вёскі Хваты, Скідэльскага сельсовета, арганізавана выехалі на лесавывазку.

Мы прыкладзем усе намаганні для таго, каб да 1 студзеня закончыць план лесазагатовак і лесавывазкі.

Хроніка

Соўнарком СССР пастанавіў перанесці дзень адпачынку з нядзелі 29 снежня 1940 г. на сераду 1 студзеня 1941 г.

У тых саюзных і аўтаномных рэспубліках, дзе ў сувязі з нацыянальнымі і бытавымі ўмовамі днём адпачынку з'яўляецца пятніца, лічыць днём адпачынку 1 студзеня 1941 года замест дня адпачынку ў пятніцу 3 студзеня 1941 года.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных даводзіць да ведама, што 1-ая сесія гарадскога Совета дэпутатаў працоўных адбудзецца 25 снежня 1940 года ў памяшканні гортэатра. Пачатак роўна ў 5 гадзін вечара.

Рэгістрацыя дэпутатаў будзе праводзіцца 25 снежня з 4 гадзін дня ў гортэатры.

ГОРВЫКАНКОМ.

Па Совецкай краіне

НАПЯРЭДАДНІ 40-ГОДДЗЯ «ІСКРЫ»

ЛЕНІНГРАД. Ленінградскі дзяржаўны інстытут журналістыкі імені В. В. Вароўскага рыхтуецца да 40-годдзя з дня выхаду першага нумара «Іскры».

Адкрыта для агляДання выстаўка, прысвечаная ленінскай газеце. На стэндах сапраўдныя нумары «Іскры» і пракламацыі, выпушчаныя іскраўцамі. На выстаўцы прадстаўлен рэдкі дакумент—маленькая лістоўка, якую ўкладвалі ў «Іскру» пры яе распаўсюджванні ў Расіі. Лістоўка гаворыць:

«...Пасылаем вам гэту рэч. Прабачце, што робім гэта без вашага дазволу. Рускія ўмовы вымушаюць нас прыбягаць да ўсемагчымых спосабаў распаўсюджвання нелегальнай літаратуры. Таму мы карыстаемся ўсякімі, нават выпадкова трапіўшымі да нас адрасамі».

24 снежня ў інстытуце адбудзецца навуковая сесія, прысвечаная першай рускай нелегальнай газеце рэволюцыйных марксістаў.

ІВАН ЮДЗІН ВЫКАНАЎ ДЗЁННУЮ НОРМУ НА 5.460 ПРОЦАНТАЎ

ЧЭЛЯБІНСК. Семівалосавец Карабашскіх медных руднікоў дэпутат абласнога совета Іван Егоравіч Юдзін (шахта «Першамайская») выканаў дзённую норму на 5.460 процантаў. Гэта роўна чатырохдзённай здабычы шахты. Юдзін зарабіў 4.040 рублёў, яго памочнік Філінаў—3.030 рублёў.

2.137 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ЭКАНОМІІ

Стаханаўцы і інжынерна-тэхнічныя работнікі лёгкай прамысловасці БССР унеслі ў гэтым годзе звыш тысячы рацыяналізатарскіх прапаноў па механізацыі вытворчасці, паляпшэнню якасці прадукцыі і эканоміі сыравіны. 444 з іх унядроны ўжо ў вытворчасць. Яны далі за год 2.137 тысяч рублёў эканоміі.

ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ЛЕНТЫ НА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ

У Цэнтральнай студыі кінохронікі праводзіцца агучанне трох фільмаў: «Краіны радасці» (рэжысёр Л. Варламаў), «Дзень новага свету» (рэжысёры Р. Кармен і М. Слуцкі) і «Казахстан» (рэжысёры Я. Пасельскі і І. Венжэр) на нямецкай, англійскай і кітайскай мовах.

5 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ НА АДПАЧЫНАК ГАРНЯКОЎ

ТУЛА. Тысячы гарнякоў Падмаскоўнага вугальнага басейна ў гэтым годзе правялі свой водпуск у санаторыях і дамах адпачынку. На курортах Сочы, Ялты, Кіславодска і іншых здраўніц поўдня адпачывалі 1.825 чалавек. У 2-тыднёвых дамах адпачынку пабывала 9688 гарнякоў і ў аднадзённых—8.460. Звыш 100 шахцёраў зрабілі турысцкія падарожжы па краіне.

У санаторыях, дамах адпачынку, у піонерскіх лагерах пабывалі 3.000 дзяцей шахцёраў. 560 выдатнікаў вучобы будуць пасланы ў дзіцячыя дамы адпачынку ў час зімовых канікул.

На адпачынак і лячэнне гарнякоў і іх дзяцей у гэтым годзе выдаткавана амаль 5 мільёнаў рублёў.

КВЕТКІ ДА СВЯТА

У аранжарэях Масквы наступіла своеасаблівая вясна. Пышна цвітуць вырашчваемыя тут бэз, цыкламены, бегоніі, цынерарыі.

Да Новага года Трэст зялёнага будаўніцтва выпусціць у продаж каля 50 тысяч розных кветак. Ад школ, дамоў культуры паступілі першыя заказы.

35 год з дня снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве

ЧЫГУНАЧНІКІ ВАЛКАВЫСКА Ў СНЕЖАНЬСКІЯ ДНІ 1905 ГОДА

Першая руская рэволюцыя 1905—1907 гадоў дасягнула свайго найвышэйшага ўздыму ў другой палове снежня 1905 года. Маскоўскі Совет рабочых дэпутатаў, кіруемы большэвіцкай партыяй, аб'явіў усеагульную палітычную забастоўку, якая ў ходзе барацьбы павінна была перарасці ва ўзброенае паўстанне.

Канферэнцыя дэпутатаў 29 чыгунак у Маскве пастанавіла аб'явіць 7 (20) снежня ўсеагульную чыгуначную забастоўку. У той-жа дзень пачался ў Маскве ўсеагульная палітычная забастоўка.

Праз два дні з'явіліся ў Маскве першыя барыкады. На працягу 9 дзён узброеныя рабочыя вялі гераічную барацьбу з царскімі войскамі, у многа пераважаючымі іх сіламі.

Гераічныя подзвігі маскоўскага пролетарыята знайшлі шырокі і жывы водгук па ўсёй краіне.

Вялікі рэволюцыйны ўздым назіраўся сярод чыгуначнікаў Палескіх чыгунак. У састаў Палескіх чыгунак уваходзіла чатыры ўчасткі: 1) Вільна—Роўна, 2) Жабінка — Гомель, 3) Гомель—Бранск, 4) Баранавічы—Беласток.

На наступны дзень пасля палітычнай снежаньскай забастоўкі ў Маскве, 8 (21) снежня тэлеграф разнесў вестку аб наступаючай забастоўцы на Палескіх чыгунках. У гэты-ж дзень забастовачныя камітэты вузлавых пунктаў Вільна, Роўна, Лунінца і Пінска паслалі ўсім чыгуначным станцыям Палескіх чыгунак цыркулярныя тэлеграмы. Ад Цэнтральнага Камітэта ў Вільні атрымана дзве тэлеграмы. У першай тэлеграме гаварылася:

«Таварышы! Маніфеста 17 кастрычніка няма, усё здабытае доўгай барацьбой адабрана: нас, чыгуначнікаў, пазбавілі права саюза і тым аддалі нас ранейшаму свавольству адміністрацыі; дзесяткі тысяч рабочых Пецербурга і Масквы выкінуты на вуліцу, Совет рабочых дэпутатаў арыштаваны. Совет дэпутатаў сялянскага з'езда арыштаваны; паштова-тэлеграфныя работнікі кінуты на волю лёсу; урад кідае выклік за выклікам, спадзяючыся на чарнасоценныя банды. Так жыць далей нельга. Лічачыся з становішчам рэчаў у дадзены момант, Цэнтральнае бюро саюза і прадстаўнікі камітэтаў 29 чыгунак прызналі неабходным аб'явіць усеагульную чыгуначную забастоўку з 7-га снежня.

Таварышы! заклікаем усіх дружна кінуць работу, не спыняць барацьбы, пакуль не будуць задаволены ўсе нашы патрабаванні».

Патрабаванні гэтыя былі: 1) прызнанне Ўсерасійскага чыгуначнага саюза, 2) неадкладная перадача ім усіх грашовых сум пенсійнай касы, 3) адмена смяротнай кары, 4) поўная амністыя ўсім змагарам за права чалавека і грамадзяніна, 5) сапраўднае правядзенне ў жыццё ўсіх свабод і 6) неадкладнае скліканне ўстаноўчага схода, выбранага ўсімі грамадзянамі на аснове прамога, роўнага і тайнага галасавання, без розніцы нацыянальнасці, веравызнання і полу.

Заканчвалася гэта тэлеграма наступнымі словамі: «Усе рабочыя масы з намі. Няхай жыве барацьба, за нашы права! Няхай жыве Устаноўчы сход! Няхай жыве Ўсерасійскі чыгуначны саюз! Мы забаставалі».

Услед за гэтай тэлеграмай у той-жа дзень была паслана з Вільні другая тэлеграма:

«Аб'яўляем забастоўку, таварышы! за правую справу ідзем на барацьбу смела».

І сапраўды, палескія чыгуначнікі пайшлі смела на барацьбу з царызмам. Ровенская група ў 12 гадзін ночы 8 снежня далучылася да забастоўкі. «Лунінец дзейнасць спыніў. Пінск далучаецца»,—паведамлялася ў тэлеграме з Лунінца. Пінск аб'явіў аб тым, што далучаецца да патрабаванняў, якія выражаны ў цыркулярнай дэпешы № 1 Віленскага забастовачнага камітэта і заклікае ўсіх чыгуначнікаў Палескіх чыгунак уключыцца ва ўсерасійскую забастоўку.

Рабочыя станцыі Валкавыск, якая належала да ўчастка Палескіх чыгунак Беласток—Баранавічы, былі актыўнымі ўдзельнікамі гэтага рэволюцыйна-забастовачнага руху.

Падзеі ў Валкавыску разгортваліся з надзвычайнай хуткасцю. 8 (21) снежня атрымана з Вільні першая тэлеграма аб пачатку забастоўкі. На скліканым зараз-жа мітынгу чыгуначнікаў было пастаноўлена: «З прычыны хуткага ходу падзей і наступіўшай забастоўкі чыгунак заснаваць часовы камітэт Баранавіцкага аддзялення Ўсерасійскага саюза чыгунак на станцыі Валкавыск...»

Часовы камітэт зараз-жа пераходзіць да дзеяння. Забастоўка праводзіцца арганізавана. Касіры спыняюць здатчыкаў грузаў і закрываюць кантору. Таварная кантора спыняе выдачу і прыёмку грузаў, таварная платформа закрываецца. Заціх грукат чыгуначных майстэрань. Толькі ў чыгуначнай кузні раздаваўся стук малаткоў і ўздувалася полымя—тут рабочыя для барацьбы выраблялі жалезныя пікі. На чыгуначнай лініі заміраe ўсё жыццё. Спачатку на вузлавых пунктах: у Баранавічах і Беластоку, а потым па ўсёй лініі Баранавічы—Беласток зусім спыняецца рух таварных і пасажырскіх паяздоў.

Рэволюцыйны настрой працоўных расце з кожным днём. У Валкавыску прымыкаюць да забастоўкі і паштовыя работнікі. Штодзённа адбываюцца мітынгі ў канторы 3-га ўчастка службы пуці Палескіх чыгунак пры ўдзеле працоўных горада. Гаварыцца прамовы аб звяржэнні царызма. Сярод сабраўшыхся распаўсюджваецца рэволюцыйныя лістоўкі. Фактычнымі гаспадарамі станцыі становяцца бастуючыя чыгуначнікі, кіруемыя забастовачным камітэтам.

Забастоўка чыгуначнікаў Валкавыска—гэта адзін з многіх этапаў забастовачнага руху на Палескіх чыгунках. Ва ўсім яе ходзе адчуваўся водгук падзей, якія адбываліся па ўсёй Расіі.

9 (22) снежня станцыя Валкавыск, як і іншыя станцыі Палескіх чыгунак, атрымаў з Баранавіч тэлеграму аб тым, што Маскоўскі і Пецербургскі вузлы бастуюць; у Маскве, Пецербургу і Харкаве да вызваленчага руху рабочых далучаюцца войскі. Заканчваецца гэта тэлеграма наступным заклікам: «Таварышы! Блізка час вызвалення ад свавольля... не застанецеся безудзельнымі ў гэты вялікі момант».

Валкавыскія чыгуначнікі жыва адгукнуліся на гэты заклік. 10 снежня другое пасяджэнне Часовага Камітэта прыняло наступную пастанову:

«Гружаныя вагоны з усякім грузам у праходзячых воінскіх паяздах і паштовыя вагоны затрымліваць да сканчэння забастоўкі. Выдачу грузаў пакуль не рабіць да атрымання ад гарадскіх арганізацый паведамлення аб недахопе ў горадзе прадметаў першай неабходнасці».

У выкананне гэтай пастановы зараз-жа часовым забастовачным камітэтам была паслана дэпеша на лініі Баранавічы—Беласток аб тым, каб гружаныя вагоны не адпраўляліся з Баранавіч і Беластока. У той-жа дзень, у 9 гадзін вечара, калі прыбыў на станцыю Валкавыск, воінскі поезд, да якога быў прычэплен паштовы вагон, чыгуначнікі не дапусцілі да пагрузкі гарадской пошты ў гэты вагон.

11 (24) снежня 1905 года валкавыскі забастовачны камітэт паведамляе Баранавічам аб рашэнні адчэпліваць паштовыя вагоны, якія следуюць з воінскімі паяздамі. Рашэнне гэта, як і ўсе папярэднія, праводзілася ў жыццё. Толькі за два дні — 11 і 12 снежня — на станцыі Валкавыск было адчэплена ад воінскіх саставаў каля 25 вагонаў з грузам. Потым рух вайсковых паяздоў быў спынен. 13 (26) снежня ў трэцім класе Валкавыскага вакзала адбыўся грандыёзны мітынг чыгуначнікаў пры ўдзеле каля 2 тысяч працоўных горада Валкавыска. Прамова старшыні забастовачнага камітэта аб немінучай гібелі царызма і аб перамозе соцыялізма была некалькі разоў перарвана крыкамі «ура» прысутных. Сярод удзельнікаў мітынга распаўсюджваліся лістоўкі, якія заклікалі да ўзброенага паўстання. На сходзе раздаваліся воклічы: «Далоў царскі ўрад!», «Далоў прыгнёт і гвалт!», «Няхай жыве народная свабода!» Гэтыя лозунгі былі прыняты двухтысячным сходам з вялікім энтузіязмам.

Перапалоханы міністр шляхоў зносін пасылае 14 снежня цыркулярную тэлеграму да ўсіх начальнікаў станцый з загадам прымяніць да бастуючых і ўзбуджаючых да забастоўкі, а асабліва да «віноўных у самавольным прысваенні сабе ўлады» на асобных участках ліній самыя суровыя меры. Палескія чыгункі аб'яўляюцца на ваенным становішчы. Валкавыская царская ахранка аказалася «перадавой» яшчэ перад аб'яўленнем загада, у ноч на 13 снежня зрабіла спробу арыштаваць старшыню забастовачнага камітэта, але рабочыя і служачыя адбілі гэтую спробу.

Апошнім водгукам чыгуначнай забастоўкі на Палескіх чыгунках была цыркулярная тэлеграма ад 17 (30) снежня, пасланая камендантам усіх станцый рускіх чыгунак. У гэтай тэлеграме чытаем: «Паўторна Гомельскі камітэт паведамляе ўсім камендантам, што для перавозкі навабранцаў і ўзброеных салдат не будзе давацца рухомых саставаў і паравозаў»... аб чым камітэт просіць паведаміць воінскіх начальнікаў і загадваючых перасоўваннем войск.

Як відаць з гэтай тэлеграмы, бастуючыя чыгуначнікі з'яўляліся яшчэ 17 (30) снежня фактычнымі гаспадарамі чыгунак.

Па ўсёй краіне ўзброеныя паўстанні і забастовачны рух былі з бесчалавечай жорсткасцю падаўлены рускім царызмам.

За годы першай рускай рэволюцыі 1905—1907 гг. працоўныя масы рабочых і сялян пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў прайшлі суровую школу рэволюцыйнай барацьбы, якая закончылася перамогай ў 1917 годзе Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй.

С. Любоўскі,
навуковы супрацоўнік Гродненскага філіяла дзяржаўнага Цэнтральнага гістарычнага архіва БССР.



Вучаніца 2-га класа Біраб іджанскай дзіцячай музыкальнай школы Валя Потніна пад кіраўніцтвам настаўніцы па класу фартэпіяна С. І. Каульберг развучвае ўрок.
Фота Н. Капаваленка. Фота ТАСС.

НЕ ПРАСІЦЬ, А ПАТРАБАВАЦЬ

Другі год ва ўсіх школах нашай вобласці заняткі праводзіцца па новай праграме, другі год вучні навучаюцца ва ўмовах совецкай школы. За гэты параўнаўча нявялікі тэрмін у школах праробдена вялікая работа. Заняткі на роднай мове прабудзілі і індывідуальныя здольнасці школьнікаў. Аб гэтым яскрава сведчаць адзнакі ў класных журналах, аб гэтым гавораць заметкі школьных, класных, атрадных і звеньевых насценгазет, якія рэгулярна выпускаюцца самімі вучнямі. Амаль у кожнай школе маюцца піонерскія і комсамольскія арганізацыі і рост іх увесь час павялічваецца.

Задача совецкай школы — выхоўваць юнае пакаленне ў духу комунізма, прывіваць дзецям разам з тэарэтычнымі ведамі практычныя навыкі і любоў да працы, расціць дастойных патрыётаў нашай радзімы. З гэтай задачай далёка не ўсе школы паспяхова спраўляюцца.

Днямі нам прышлося пазнаёміцца з работай у 9-ым класе гродненскай школы № 1. У класе з 27 вучняў 16 з'яўляюцца членамі комсамола. Здавалася-б, што клас павінен быць вядучым, паказваць прыклад паспяховасці і дысцыпліны, але на вялікі жаль, гэтага няма.

Працоўная дысцыпліна ў гэтым класе дрэнная. Пачынаецца ўрок беларускай мовы. Выкладчыца П. Філіповіч пасля званка вымушана некалькі мінут чакаць, пакуль у класе сціхне шум. У часе ўрока комсамольцы Чыжык, Навіцкі, Талкачова бесперашкодна займаюцца прыватнымі размовамі. Яны нават не паважаюць настаўніка і на заўвагі яго не звяртаюць ніякай увагі. Да сваёй вучобы, да сваіх абавязкаў у школе яны таксама адносяцца бесклапотна. У першай чвэрці навучальнага года яны мелі па дзве—тры дрэнных адзнакі, а зараз лічба дрэнных адзнак яшчэ больш павялічылася. Многія комсамольцы не выконваюць дамашніх заданняў. Комсамолец Навіцкі, Любашоў зусім не працуюць над мовай.

І гэта робяць свядомыя дарослыя людзі, стаячыя на парозе заканчэння сярэдняй школы, на парозе самастойнага жыцця.

Комсамольская арганізацыя (комсорг тав. Ермакова) і дырэкцыя школы, замест рашучага патрабавання ад вучняў і асабліва комсамольцаў, дысцыплінаванасці, выканання ўсіх абавязкаў сумленнага школьніка, займаюцца ўпрашваннем. Ні аднаго разу комсамольская арганізацыя школы не ставіла гэтага пытання на комсамольскім сходзе. Таму многія комсамольцы не працуюць, не адчуваюць адказнасці перад дзяржавай, якая на іх вучобу затрачвае вялікія сродкі.

Зараз у школах гарачая пара: падводзяцца вынікі вучобы за першае паўгоддзе. Комсамольскія і піонерскія арганізацыі школ павінны паставіць работу так, каб кожны піонер і комсамолец закончыў першую палову навучальнага года паспяхова.

П. Дубравін.

Паспяхова завяршаем фінансавы план

Бельскі раён у першым паўгоддзі адставаў з выкананнем фінансавага плана. Мы паставілі перад сабой задачу—неадкладна ліквідаваць адставанне, дагнаць перадавыя раёны вобласці і перагнаць спаборнічаючы з намі Бранскі раён. Пачалі перш за ўсё з укамплектавання апарата лепшымі людзьмі. У маі былі поўнасцю падабраны падатковыя агенты.

Райфінаддзел аказваў практычную дапамогу падатковым агентам. З імі тры разы ў месяц праводзіліся кароткія інструктыўныя нарады, на якіх абмяркоўваліся бягучыя фінансавыя пытанні. Тут-жа абменьваліся вопытам работы перадавых падатковых агентаў і гэтым самым падцягвалі адстаючых.

Работнікі правялі вялікую масава-растлумачальную работу сярод працоўных, у выніку—падатковыя абавязкі перад дзяржавай былі датэрмінова выкананы і мы паспяхова закончылі фінплан 1940 года. Даходная частка бюджэта перавыканана яшчэ да 1-га кастрычніка. Сельгаспадатак калгасы і сяляне ўнеслі поўнасцю да 1-га снежня. Страхавыя плацяжы выкананы па раёну на 100 процантаў, унесены ў асноўным поўнасцю ўзносы па Пазыцы Трэцяй пяцігодкі.

Фінансавы план трэцяга квартала выканан на 202 проценты. План 4-га квартала значна перавыканан да 5-га снежня—Дня Сталінскай Канстытуцыі.

М. Дзюба,
загадчык бельскага райфінаддзела.

Здань голаду над Еўропай

Еўропа, Азія, Афрыка з'яўляюцца тэатрамі ваенных дзеянняў. Першы год другой імперыялістычнай вайны прынёс працоўным капіталістычных краін незлічоныя лішэнні. Вайна прайшла праз Францыю і малыя краіны Еўропы, апустошыўшы палі, разбурыўшы гарады; жыццё замёрла ў партах і на чыгуначных вузлах, на фабрыках і заводах. Тэрыторыі дзяржаў, чые арміі склалі аружжа, прадаўжаюць падвяргацца паветраным налётам.

Працоўныя капіталістычных краін Еўропы з велізарнай трывогай чакалі наступлення зімы: яна несла ім новыя лішэнні, новыя пакуты. Яшчэ летам гэтага года прадстаўнік амерыканскага таварыства Чырвонага Крыжа Малоні заявіў, што к «лістападу ў Еўропе 35 мільёнаў чалавек будзе знаходзіцца на грані голаду». Цяпер Малоні змог-бы значна павялічыць гэту лічбу.

Ужо самы пачатак вайны нанёс удар сельскай гаспадарцы Еўропы. У верасні мінулага года ва ўсіх еўрапейскіх капіталістычных краінах, вялікіх і малых, ваюючых і нейтральных, была праведзена мабілізацыя. Адсутнасць неабходнай рабочай сілы і масавая рэквізіцыя коней для патрэб арміі сарвалі азімую сяўбу. Ва Францыі не менш паловы палёў засталіся незасеянымі, значны недасеў меў месца ў Бельгіі, Галандыі і іншых краінах. Мабілізацыя перашкодзіла сяўбе і ў прыдунайскіх краінах, дзе пасяўная плошча скарацілася на 10—20 проц. Жорсткая зіма і дажджлівая вясна, замаразкі, сухавеі і паводкі яшчэ больш пагоршылі ўмовы росту хлябоў. У выніку ўсіх гэтых прычын агульны збор зернавых у Еўропе склаў, па падліках Міжнароднага аграрнага інстытута ў Рыме, не больш 400 мільёнаў цэнтнераў замест 440 мільёнаў, сабраных у 1939 годзе. Амерыканскія статыстыкі лічаць рымскую ацэнку надта аптымістычнай; па падліках дэпартамента агрыкультуры ЗША, збор хлябоў у Еўропе не перавысіў 370 мільёнаў цэнтнераў. Такім чынам, дэфіцыт складае каля 70 мільёнаў цэнтнераў. Аднак гэтым справа яшчэ не абмяжоўваецца. Еўрапейскія кантынентальныя краіны звычайна прывозілі каля 50—60 мільёнаў цэнтнераў хлеба. Блакада робіць прывоз такой колькасці зернавых немагчымым. Агульны недахоп жыта і пшаніцы складзе 120—130 мільёнаў цэнтнераў, гэта значыць звыш 25 процантаў нармальнага спажывання капіталістычных краін Еўропы.

Але вайна нанесла ўдар не толькі зернавой гаспадарцы еўрапейскага кантынента. Яшчэ больш пацярпела жывёлагадоўля. Вайна выклікала востры недахоп кармоў у краінах з развітай жывёлагадоўчай гаспадаркай, у асаблівасці ў Галандыі, Даніі і Швейцарыі, якія, як вядома, снабжалі амаль усю Еўропу маслам, маргарынам, салам, бэконам, свінінай, прадуктамі птушкагадоўлі. З-за адсутнасці кармоў у Даніі колькасць свіней ужо скарацілася на 30 процантаў, пагалоўе буйнай жывёлы зменшылася на 750 тысяч галоў, хатняй птушкі—на 50 процантаў. Стаіць пытанне аб далейшым скарачэнні колькасці стада. Дацкая газета «Берлінгске тэдэндэ» заклікае насельніцтва ўзмацніць убой жывёлы. «Усё гэта,—піша газета,—павінна быць праведзена самімі сельскімі гаспадаркамі і чым хутчэй, тым лепш, інакш кармоў для жывёлы не хопіць». У Галандыі ўлады распарадзіліся прырэзаць 12 мільёнаў курэй—дзве трэці ўсёй колькасці хатняй птушкі ў гэтай краіне. Мяркуюць, што там будзе забіта і вялікая колькасць жывёлы.

Найбольш неспрыяючымі з'яўляюцца харчовыя перспектывы ва Францыі. Нават па афіцыяльных даных, ураджай гэтага года склаў: па зернавых 60 процантаў нармальнага, па бульбе—55 процантаў, па цукровых бураках 20—30 процантаў.

Гэтыя даныя яшчэ не адлюстроўваюць сапраўднага становішча рэчаў, бо невядома, што-ж фактычна было атрымана. Норма выдачы бульбы ва Францыі ўжо зараз не перавышае чатырох з паловай фунтаў у тыдзень. Малако выдаецца толькі дзецям да 14 год. З продажу зніклі цяляціна і бараніна. Нарміраван продаж хлеба (350 грамаў у дзень), мяса (300 грамаў у тыдзень), сыру (40 грамаў у тыдзень), тлушчаў (80 грамаў у тыдзень), мыла (100 грамаў туалетнага, 75 грамаў гаспадарчага ў месяц), кофе, рысу. Нават карэспандэнт швейцарскай «Газет дэ Лозан», які імкнецца прыўкрасіць становішча ва Францыі Петэна — Лаваля, павінен прызнаць, што Францыя бежанцаў і вялікіх гарадоў. дзе снабжэнне яшчэ не арганізавана, будзе жорстка цярпець прадстаячай зімой.

Бельгія і Галандыя з'явіліся тэатрам ваенных дзеянняў. Але і пасля капітуляцыі іх армій гарады і вёскі гэтых двух краін, у асаблівасці парты і чыгуначныя вузлы, падвяргаюцца бесперапынным бамбардыроўкам з боку англійскай авіяцыі. У гэтых краінах таксама ўведзен нарміраваны продаж харчоў. У Бельгіі харчовае становішча ўсё пагаршаецца. Малако выдаецца толькі дзецям і хворым.

У Швейцарыі ўведзен нарміраваны продаж рада прадуктаў. Масла выдаецца па 300 грамаў на чалавека ў месяц, рысу—500 грамаў і т. д.

Бурныя вясеннія паводкі і дажджы другой паловы лета рэзка скарацілі збор хлябоў у краінах Дунайскага басейна. У Югаславіі ўраджай зернавых у параўнанні з мінулым годам знізіўся на 30 процантаў. Гэта выклікала значны рост цэн на прадукты сельскай гаспадаркі; бульба падаражэла ў два разы, жыта і авёс—у два з паловай разы. У Венгрыі ўраджай знізіўся на 25 процантаў. Малочныя прадукты моцна падаражэлі. Уведзены тры посных дні ў тыдзень. Насельніцтва не атрымлівае сала нават па картках. У Грэцыі ўраджай зернавых на 30 процантаў менш мінулагодняга.

З усіх краін Дунайскага басейна горш усяго склалася харчовае становішча ў Румыніі. Па падліках «Румынскага інстытута вывучэння эканамічнай кан'юнктуры» ураджай пшаніцы склаў 165 тысяч вагонаў, гэта значыць менш паловы мінулагодняга. Збор вінаграду не перавышае 15 процантаў звычайнага. Садавіна і гародніна (акрамя бульбы) далі не больш 50 процантаў сярэдняга збору, бавоўна—20 процантаў. У Румыніі рэзка растуць цэны: за адзін год раслІннае масла падаражэла на 80 процантаў, вінаград—на 300, фасоль—на 400, цыбуля—на 300, малочныя прадукты—на 250—300 процантаў. Газета «Універсул» піша, што «такога велізарнага росту цэн не зарэгістрыравала ні адна краіна нават з тых, якія больш года знаходзяцца ў становішчы вайны».

Значна ніжэй сярэдняга ўзроўню збор зернавых і гародніны ў скандынаўскіх краінах. У Швецыі ўраджай хлябоў і траў аказаўся менш звычайнага ў два разы, збор бульбы на 20—25 процантаў ніжэй сярэдняга. З прычыны недахопу кармоў вытвараецца ўзмоцнены ўбой жывёлы. Свініна выдаецца па картках, норма—200 грамаў у тыдзень. Уведзен нарміраваны продаж усіх сартоў хлеба. У Нарвегіі норма водпуску хлеба скарочана да 325 грамаў у дзень, кофе выдаецца 60 грамаў у тыдзень. Уведзены карткі на пячэнне, макаронныя вырабы, на піражныя і бутэрброды, якія прадаюцца ў кафэ і сталовых.

У Фінляндыі ўведзены карткі на сыр, гарох, малако, мыла. З 22 лістапада ўведзены карткі на мяса і мясныя прадукты. На першыя дзесяць дзён устаноўлена норма ў 500 грамаў мяса і мясных прадуктаў. Устаноўлена два посных і тры «бязмасленых» дні ў тыдзень. У сталовых і рэстаранах забаронена падаваць блюды, якія ўтрымліваюць больш 15 процантаў тлушчаў. У Даніі ўведзены карткі на хлеб. Месячная норма водпуску—6 кілограмаў чорнага хлеба і 2 кілограмы пшанічнага.

Карэспандэнт газеты «Нью-Йорк таймс», які падарожнічаў па Іспаніі, піша, што ён паўсюды назіраў там востры недахоп харчоў. У гарадах хлебны паёк вагаецца ад чвэрці да поўфунта ў дзень. Тыднёвая норма выдачы прадуктаў складае 75 грамаў чачавіцы, 50 грамаў цукру, 75 грамаў рыбы, 1 кілограм бульбы, чвэрць літра раслІннага масла. Іспанскае насельніцтва, як сцвярджаюць замежныя аглядальнікі, у велізарнай сваёй частцы знаходзіцца на грані вострага недаядання.

У Англіі ў тыдзень выдаецца 56 грамаў масла.

Зімні перыяд яшчэ толькі пачынаецца, але ўжо зараз працоўныя капіталістычных краін Еўропы адчуваюць велізарныя харчовыя цяжкасці. Да голаду далучаецца яшчэ і холад. Нехапае вугалю для атаплення дамоў. Грамадзянскі аўтамабільны транспарт амаль поўнасцю пазбаўлен гаручага. У Ротэрдаме (Галандыя) жыхары прастойваюць гадзінамі ў чаргах на вугаль. Ва Францыі нават чыгункі не маюць неабходнага ім паліва. У скандынаўскіх краінах водпуск вугалю насельніцтву даведзен да мінімума.

Другая імперыялістычная вайна яшчэ больш пагоршыла становішча працоўных мас капіталістычных краін, яшчэ больш узмацніла іх галечу. Наступныя месяцы пагражаюць шырачэйшым народным масам ваюючых і нейтральных краін Заходняй Еўропы новымі лішэннямі.

Пісьменнікі Беластока

Бінем Гелер

Бінем Гелер — адзін са здольнейшых прадстаўнікоў малодшага пакалення яўрэйскіх паэтаў былой Заходняй Беларусі. Выхадзец з бяднейшых слаёў яўрэйскага насельніцтва, з дзяцінства глыбока ўпітаў ён у сябе горыч і пакуты іх цяжкага жыцця. З першага-ж свайго паяўлення ў літаратуры ў 1930—1931 годах Гелер аднёсся да сваёй працы, як да сур'ёзнай грамадскай справы, здольнай ускрыць сутнасць акаляючай рэчаіснасці.

Дзве небяспекі таіліся на творчым шляху Гелера. Небяспека абагульнення, падняцця трагічнага канфлікта яўрэйскага дробнага мяшчанства да нейкай адцягненай катэгорыі, да сусветнага трагізма, наогул, які многіх паэтаў дробна-буржуазнага паходжання настрайваў на пастаянны песімістычны лад.

Другая небяспека таксама абагульняючага характару, толькі з процілеглага боку: небяспека поўнага адмаўлення гэтага трагізма. У абодвух выпадках атрымалася-б адцягненасць, вершы па-за часам і прасторай. Але Гелер гэтыя небяспекі мінуў, лепш сказаць, ён іх праздолеў. Перад Гелерам, які вырас і выхаван у рэвалюцыйнай групе пісьменнікаў былой польскай дзяржавы, быў звязан арганізацыйна з авангардам рабочага класа, знаходзіўся пад яго пастаянным уздзеяннем, заззяў вялікі ідэал вызвалення ўсіх працоўных. Гэтыя два элементы—змрочная рэчаіснасць і светлы ідэал—у творчасці Гелера арганічна зрасліся як у іх пярвічным перажыванні, так і ў іх паэтычным выражэнні. Гэта і ёсць тое своеасаблівае ў Гелера, дзякуючы чаму ён займае асобае месца ў маладой яўрэйскай паэзіі.

Ужо ў першай кніжцы яго вершаў, надрукаванай у 1932 годзе, гэта асаблівасць паэзіі Гелера [illegible] сваё поўнае выражэнне. Трагізм яўрэйскай бедпаты не расплываецца ў беспрадметным песімізме.

Яшчэ ярчэй гэта асаблівасць творчасці Гелера выступае ў яго другой кнізе, у паэме «На вятры», якая вышла ў свет у 1936 годзе. Вось гэты раман у 18 песнях як па форме, так і па зместу нежным паэтычным узорам выткан на канве шэрай непрыглядпай рэчаіснасці. Ніякай ідэалізацыі любві ў яе зараджэнні і ніякіх безатрадных вывадаў «наогул» у яе трагічнай развязцы. Любоў працоўнай і беспрацоўнай моладзі ў былой панскай Польшчы тут даецца такой, якой яна была на самай справе, любоў «на хаду», для якой месцам спатканняў была дэманстрацыя і будуарам—вуліца. Гэта трагічны дакумент капіталістычнай рэчаіснасці, прасякнуты вялікай паэтычнай нежнасцю і ледзь прыкметным тонкім смуткам, і таму ён не ператвараецца ў крык. Ціхі лірызм і стрыманасць пачуцця Гелера дасягаюць тут двоякай мэты: ён узмацняе ізабражэнне жахлівай рэчаіснасці і адначасова ён гэту рэчаіснасць мастацка перамагае. Найглыбейшыя перажыванні перадаюцца ў гэтай паэме ціха і проста. Гэта імкненне да прастаты і яснасці, імкненне выразіць як мага больш пачуцця ў простых словах, пастаянныя клопаты аб спалучэнні суб'ектыўных адносін да рэчаіснасці з мастацкай шчырасцю—усё гэта характэрныя рысы паэзіі Гелера з першага яго выступлення ў літаратуры.

У 1934—1937 годах Гелер жыве ў Парыжы. Але і там не пакідаюць яго змрочныя прывіды нястачы, палітычнага прыгнечання і маральнай надаўленасці працоўных у Польшчы. Туга па радзіме авалодвае ўсёй яго істотай, і гэта туга знаходзіць сваё выражэнне ў радзе выдатных, пранікнёных вершаў. На сваёй паэтычнай шчырасці, высокаму рамантычнаму ўзлёту і глыбокаму лірызму некаторыя з іх маюць вялікую мастацкую каштоўнасць. Але нават у гэтым сваім настроі Гелер не ў сілах адарвацца ад пачуцця грамадскай адказнасці. Гэта не беспрадметная туга, адцягненае пыццё па радзіме, але туга з пэўным зместам, з пэўным напрамкам, маючым канкрэтныя прычыны і мэты. Гелер забыць не можа, што ён дома пакінуў бацьку і маці ў нястачы і таварышоў, якія паўсядзённа вядуць няроўны крывавы бой. Яго не пакідаюць угрызенні сумлення, што ён маладушна пакінуў поле бітвы.

Гэта пачуццё раскаяння, глыбокая адказнасць за ўсё, што адбываецца на радзіме, надаюць вершам Гелера своеасаблівы характар, напаўняюць іх зместам і канкрэтнасцю, узмацняюць іх непасрэднае ўздзеянне.

Слова Гелера, знешне ціхае і стрыманае, пры ўсёй яго бунтарскай напружанасці, становіцца больш гарачым, бурлівым, нецярплівым.

У гэты перыяд Гелерам часамі авалодваюць настроі роспачы. Яго сум, упаследваны ім ад безвыходнага жыцця, яго асяроддзя,—сум, які так гарманічна ўплятаўся ў светлую мару аб свабодным будучым і складаў унутраную цэльнасць яго вершаў — часта цяпер ламаецца. З аднаго боку, праступаюць мінорныя тоны беспрычыннай, беспрасветнай тугі, з другога,—словы пратэсту супроць сябе і супроць усіх. Але гэта іменна толькі часам, у «мінуты жыцця цяжкага», у выгнанні. Па сутнасці, верш Гелера захоўвае сваю спецыфічную своеасаблівасць інтымнага адзінства паміж момантамі тугі і смутку, з аднаго боку, і барацьбы і надзей на лепшае заўтра,—з другога, што знаходзіць самае рэльефнае адлюстраванне ў цыкле санетаў, напісаных у гэтым перыядзе. Лірычныя вершы Гелера таго часу глыбока перажыты і напісаны з яснасцю і прастатой, соцыяльныя яго матывы, як і заўсёды, пранікнуты паэтычнай праўдзівасцю і шчырасцю.

Круты паварот заўважаецца ў паэзіі Гелера пасля вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Туга, якая была неад'емнай часткай паэзіі Гелера ў часы заняволення і прыгнёту, адступае на задні план, як хваравіты ўспамін цяжкага мінулага, і на пярэдні план выступае вялікае пачуццё радасці. Новае жыццё выклікае ў Гелера моцную паэтычную прагнасць творчасці. Не дзіва, што ўсякае з'явішча, усякая падзея новага жыцця будзяць у паэта глыбокія перажыванні, якія адрозніваюцца ад папярэдніх тым, што яны ўзнікаюць у атмасферы свабоды і радасці і авеяны вялікай любоўю і адданасцю.

У мінуты нахлынуўшых пачуццяў многія паэты гатовы ад радасці павысіць голас і ад натхнення крычаць. Але Гелер і ў гэтым выпадку праявіў сябе паэтам з пачуццём меры і сапраўднага перажывання. Дзесяткі новых песень, напісаных Гелерам на вызваленай зямлі на разнастайныя тэмы—вершы аб Леніне, аб Сталіне, Чырвонай Арміі, лётчыках, аб нашым будаўніцтве і т. д.—паказваюць праўдзівасць і непасрэднасць яго перажыванняў, яго сур'ёзныя, адказныя адносіны да сябе, да сваёй паэтычнай місіі, бо, як гаворыць сам Гелер:

«У кожнага ёсць свой напеў,—
ідзе ён скрозь жыццё, як кроў,
ідзе як рытм сваіх шагоў,
такі у кожнага напеў».

І напеў Гелера іменна такі.

Д. Сфард.

Зробім Выгоду ўпарадкаванай і культурнай

На сустрэчы з тав. Грабоўскім — кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета ад Выгоды — выбаршчыца тав. Рагоцкая сказала:

— Мы ўсе будзем галасаваць за нашых кандыдатаў, бо гэта людзі з народа. Аднак мы ад іх патрабуем дапамагчы нам палепшыць культурна-бытавыя ўмовы нашай рабочай Выгоды.

Тав. Рагоцкая выказала думку ўсіх выбаршчыкаў, як і трэба было чакаць. Да кіраўніцтва ў гарадскі Совет прыйшлі народныя выбраннікі, якія кроўна звязаны з намі, і мы ў праве патрабаваць ад іх, каб яны звярталі самую сур'ёзную ўвагу на нашу рабочую ўскраіну.

Былы польскі ўрад памешчыкаў і капіталістаў, гарадскія тузы з Беластоцкага магістрата наогул не цікавіліся патрэбамі працоўных, у асаблівасці рабочымі ўскраінамі. Выгода, гэты буйны пролетарскі раён з 10-тысячным насельніцтвам, не мела ніякіх умоў для чалавечага жыцця. Совецкая ўлада—адзіная справядлівая ўлада ў свеце—зрабіла для нас вельмі многа за 15 месяцаў свайго існавання. Мы ўсе атрымалі работу, нашы дзеці бясплатна вучацца ў школах на сваёй роднай мове, у нас бясплатнае лячэнне, мы карыстаемся водпускам за кошт дзяржавы. Сталінскія клопаты аб чалавеку адчувае кожны з нас. Мы ведаем, што гэта толькі пачатак той вялікай творчай работы, якая накіравана на дабро працоўных.

Аднак мы звяртаем увагу нашых дэпутатаў гарадскога Совета на рад нявырашаных яшчэ задач, якія звязаны з хутчэйшай ліквідацыяй спадчыны мінулага. Гутарка ідзе аб адкрыцці амбулаторыі на нашай ускраіне, каб мы гэтае бясплатнае лячэнне мелі тут-жа, на месцы.

Трэба тут адкрыць магазіны — харчовыя і промтаварныя, бо на ўсю Выгоду ў нас ёсць толькі адзін невялікі бакалейны магазін, які ні ў якім разе не задавальняе патрэбы жыхароў. Можна хутка, не трацячы многа капітальных сродкаў, правесці вадаправод, зрабіць тратуары. Мы таксама падымаем пытанне аб пабудове ў 1941 годзе школы для нашых дзяцей, каб яны не хадзілі вучыцца за 3—4 кілометры ў горад. Варта таксама падумаць і аб адкрыцці клуба для культурнага адпачынку жыхароў Выгоды.

Мы ўпэўнены, што гарадскі Совет дэпутатаў працоўных зробіць усё, каб Выгода стала ўпарадкаванай і культурнай рабочай ускраінай.

Жыхары Выгоды, рабочыя механічнага завода № 35: **А. Радкевіч, А. Лукашык, Э. Хом, Р. Славінскі, В. Санчык, Э. Яцэвіч.**

Павядзём рашучую барацьбу з спекуляцыяй

Нармальную работу гандлюючых совецкіх арганізацый у многіх месцах дэзарганізуюць жулікі і прахадзімцы ў мэтах спекуляцыйнай нажывы, штучна ствараюць чаргу за асобнымі таварамі. Ёсць цэлыя групы людзей, якія толькі тым і займаюцца, што ходзяць па магазінах, скупляюць тавары і ствараюць у сябе запасы. Гэтыя стваральнікі «запасаў» таксама-ж, як і спекулянты, падрываюць наш совецкі гандаль.

За апошнія месяцы органамі рабоча-сялянскай міліцыі Беластока і вобласці, пры актыўнай дапамозе працоўных, выкрыт цэлы рад спекулянтаў і скупшчыкаў харчовых і прамысловых тавараў.

Арыштаваны і аддаены суду загадчык складам базы «Тэкстыльзбыту» Іцка Леў, яго дачка Юдэс, тавараведбазы Ісак Марк, былыя гандляры, якія, карыстаючыся сваім службовым становішчам, пры падтрымцы асобных работнікаў Беластоцкага горхарчпромгандлю на працягу доўгага часу пры водпуску тавараў з базы бралі ў сваё асабістае карыстанне мануфактуру, якую потым пераправілялі ў іншыя гарады і прадавалі па спекуляцыйных цэнах. Яны раскралі больш 2.000 метраў мануфактуры.

Арыштавана група спекулянтаў у колькасці 7 чалавек—работнікаў абутковай секцыі Беластоцкага паказальнага універсальнага магазіна: загадчык секцыі Ліпшыц Лейб, старшы прадавец Арбуз Фрыда, касірша Шыняк Дзіна і іншыя, якія частку атрымліваемага абутку ў магазіне для продажу насельніцтву затрымлівалі і перадавалі спекулянту г. Семяціч, Брэсцкай вобласці, Арлянскаму Анчко, а апошні ў сваю чаргу абутак прадаваў па спекуляцыйных цэнах.

Арыштаваны і аддаюцца суду Броер Лейзер, Пам Лейба, Міневіцкі Бінеямін і Нарэўскі Хаім—жыхары г. Высокае, Брэсцкай вобласці, былыя гандляры, якія на працягу двух дзён хадзілі па магазінах Беластока і скуплялі прадукты харчавання і прамысловыя тавары. Пры затрыманні ў іх адабрана 90 кілаграмаў цукру і многа іншых прадуктаў.

Арыштаван і аддаецца суду Аляксандр Бароўскі, былы гандляр г. Пружаны, які закупіў у Беластоку 50 кілаграмаў цукру, 88 метраў мануфактуры і многа іншых тавараў.

Задача кожнага чэснага грамадзяніна—весці бязлітасную барацьбу з спекулянтамі і скупшчыкамі тавараў, узмацніць дапамогу органам рабоча-сялянскай міліцыі ў выкрыцці і аддачы суду ворагаў народа.

Начальнік аддзела барацьбы з раскраданнямі і спекуляцыяй Упраўлення Рабоча-Сялянскай міліцыі Беластоцкай вобласці, лейтэнант міліцыі

Т. Каваленка.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Кніга аб вызваленчай барацьбе беларускага народа

Дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, беларускі народ атрымаў сваю незалежнасць. Яна не толькі дала беларусам магчымасць кіравання сваім лёсам, але і вызваліла іх назаўсёды ад эканамічнага і соцыяльнага прыгнечання ўласнымі і іншакраіннымі капіталістамі і памешчыкамі.

Прагна жадаючы свабоды, народ заваяваў яе уласнай крывёй, уласнымі рукамі, упорна змагаўся супроць варожага нашэсця польскай буржуазіі.

Тым геройскім дням прысвечана кніжка «Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919—1920 году»*). Яна мае часткова характар дзённікаў у добрай літаратурнай апрацоўцы беларускіх пісьменнікаў, а ў канцы кніжкі апублікаваны каштоўныя і цікавыя дакументы часоў польскай акупацыі. Кніжка выдана з густам і мае шматлікія ілюстрацыі.

Чырвоныя партызаны змагаліся з бязмежнай самаадданасцю. Яны ведалі аб тым, што іх удары на тылы польскай арміі, знішчэнне паяздоў з амуніцыяй, адрэзванне шляхоў зносін, безумоўна, пацягнуць за сабой крывавы адказ карных экспедыцый. Але гэта не ўстрымлівала іх ад барацьбы. Белапалякі падпальвалі вёскі з усіх бакоў, а ўцякаючых жыхароў агнём кулямётаў заганялі назад у палымнеючыя хаты. У вёсцы Дражно (Жыцінская воласць) з 196 дамоў засталося пасля такога нападу толькі 16. Акупанты адбіралі жывёлу і коней, накладвалі кантрыбуцыю. Асабліва крывавую ролю ў местачковых пагромах ігралі воінскія часці з Пазнанскай вобласці, пазнанцы, або, як сяляне іх празывалі, «паганцы».

Тыл польскай арміі на Беларусі быў ахоплен народнай вайной. Нелегальныя большэвіцкія камітэты арганізоўвалі і ўзбройвалі партызанскія атрады, якія вялі барацьбу супроць белапольскіх акупантаў.

Да таго-ж польская армія не была адзінай. Польскія рабочыя і сяляне ў салдацкіх мундзірах неаднаразова дапамагалі партызанам, забяспечвалі іх зброяй, давалі ім патрэбныя ваенныя звесткі. Рыдз-Сміглы вымушан быў выдаць загад па арміі аб уплывах комуністаў у польскай арміі. 18 польскіх салдат застрэлілі свайго камандзіра і аблягчылі палкам Чырвонай Арміі перайсці Бярэзіну. Паміж 14 рэволюцыянераў, расстраляных польскімі акупантамі ў Слуцку, было трое польскіх салдат-комуністаў. Як і іх беларускія браты, яны сустрэлі смерць з песняй «Інтэрнацыянал».

З апублікаваных у кніжцы дакументаў асаблівую ўвагу заслугоўвае загад польскага камандавання, які забараняе салдатам размаўляць па-руску з мясцовым насельніцтвам.

З прадмовы да гэтай дакументальнай кніжкі мы даведваемся аб тым, што рэдакцыя прыступіла да збірання матэрыялаў аб барацьбе працоўных Заходняй Беларусі ў 1919 — 20 годах. Гэтыя дакументальныя матэрыялы акажуць вялікую дапамогу нашым агітатарам у іх рабоце.

А. Аскола.

*) Выданне сакратарыята галоўнай рэдакцыі гісторыі грамадзянскай вайны—ОГІЗ 1940, 189 старонак.

НА ВЫСТАЎЦЫ БЕЛАСТОЦКІХ ТКАНІН

Дрэнная якасць шарсцяных тканін, якую выпрацоўвала тэкстыльная прамысловасць Беластока, выклікала справядлівыя папрокі швейнай прамысловасці і гандлюючых арганізацый. Перад тэкстыльшчыкамі Беластока паўстала пачэсная задача—дабіцца выпуску высокаякасных і прыгожых тканін, якія-б не ўступалі па афармленню тканінам, выпускаемым фабрыкамі ўсходніх абласцей.

Упершыню наладжаная ў Беластоку выстаўка тканін паказвае, што нашы тэкстыльныя прадпрыемствы дабіліся нядрэнных вынікаў. Выключна добрыя па якасці малюнка і расцветкі прадстаўлены ўзоры трыко «унізн» камбінатамі № 4 і 7. Таксама нядрэнныя ўзоры артыкула трыко фасона 854.

Неабходна адзначыць добрыя па якасці і афармленню прадстаўленыя ўзоры драпа артыкула 879 камбіната № 3. Добрым таксама з'яўляецца драп кліпцоўскі 242, прадстаўлены камбінатамі № 2 і 5.

На жаль, не ўсе ўзоры трэба лічыць падыходзячымі. Прадстаўленыя ў малай колькасці ўзоры камбінатаў №№ 6 і 10 былі поўнасцю адхілены. Гэты сігнал павінна ўлічыць кіраўніцтва камбіната № 10 і больш увагі ўдзяліць пытанню афармлення тканін. Як адмоўны бок, трэба адзначыць адсутнасць дастатковай колькасці тканін светлых рысункаў. Таксама мала прадстаўлена ўзораў драпаў на пальто, у той час, калі швейная прамысловасць і гандлюючыя арганізацыі прад'яўляюць вялікі попыт на гэтыя тканіны.

Праглядаючы выстаўку, відаць, што беластоцкія тэкстыльшчыкі дабіліся значных поспехаў. Але на гэтым супакойвацца нельга. Трэба прыкласці ўсе намаганні, каб беластоцкія тканіны сталі самымі лепшымі, самымі прыгожымі.

В. Нахімоўскі.

Хто вінаваты?

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У сакавіку гэтага года ў 4-х кілометрах ад раённага цэнтра Скідэля арганізавалася МТС. Раённы аддзел сувязі абслугоўвае МТС вельмі дрэнна. Да лістапада пошту дастаўлялі праз дзень, а ў лістападзе за 13 дзён даставілі толькі адзін раз. Тэлеграма зямельнага абласнога аддзела, прыбыўшая ў райаддзел сувязі 6 лістапада, была нам дастаўлена толькі 11 лістапада.

Не гледзячы на тое, што прэзідыум раённага выканаўчага камітэта даўно абавязаў райаддзел сувязі забяспечыць МТС тэлефонам, райаддзел сувязі да гэтага часу нічога не зрабіў і ў гэтым напрамку.

А. Бурдзін,
дырэктар Скідэльскай МТС.

ЗЯМЛЯ

У кабінет загадчыка райземаддзела тав. Шведава з крыкам і лаянкай увалілася група сялян вёскі Ясінаўка. Чаго хацелі прышоўшыя, чаму яны так спрачаліся—цяжка было зразумець. У кабінеце страсці яшчэ больш разгарэліся. Скандал пагражаў перайсці ў бойку. Бачачы гэта, тав. Шведаў адразу не ведаў, што рабіць. Затым ён загадна і голасна заявіў:

— Чаго буяніце, дзе вы знаходзіцеся? Гаварыце толкам, у чым справа.

Гэтыя словы падзейнічалі. Спрэчка прыціхла. Тады адзін з малодшых братоў Лубенскіх, заікаючыся ад злосці, скарагаворкай выпаліў:

— Старэйшы брат зямлю маю хоча забраць. Мне дае горшую, а сабе бярэ на выбар.

Гэта заява малодшага Лубенскага выклікала новы ўзрыў абурэння. Старэйшы з братоў размахваў рукамі, мітусіўся, крычаў і пагражаў. Толькі праз некаторы час адзін з прышоўшых сялян растлумачыў:

— У братоў памёр бацька. Цяпер сыны ніяк не падзеляць зямлю. Кавалачак зямлі зрабіў іх лютымі ворагамі. Воўкам стаў брат брату. Вось і нас яны прывялі ў сведкі. У сельсовеце не [illegible] гэту справу [illegible] просім разабрацца. Чаго добрага, хто-небудзь з іх можа без галавы астацца: абодва гарачыя.

Загадчык райземаддзела зразумеў усю сутнасць пытання. Пачалася гутарка. Тав. Шведаў стаў расказваць пра зямлю, якая з'яўляецца здабыткам народа, пра яе сапраўднага гаспадара—совецкую дзяржаву, пра новыя погляды на зямлю, пра шчаслівае жыццё вызваленага народа і пра цяжкасці перамагання перажыткаў мінулага.

У гэты самы час у кабінет увайшоў сярэдніх год невысокага росту мужчына. Ён распіхваў стаяўшых, прабіраўся наперад. Гэты жэст госця многім не спадабаўся.

— Адкуль узяўся? Куды лезеш? Бачыш—справай заняты, а ты перашкаджаеш,—адразу заўважылі прышоўшаму некалькі чалавек. На гэта ён адказаў:

— Бачу я вашы справы. Як відаць, няма чаго рабіць, вось і займаецеся глупствам. Прайшлі тыя часы, што за зямлю забівалі адзін другога. А ў мяне справа важная, грамадская. Я прышоў сюды па тэрміновых калгасных справах. А каму мала зямлі—ідзіце да нас, у нас яе хоць адбаўляй.

Затым падміргнуў стаяўшаму поплеч мужчыну, закончыў:

— Спраў у калгаснікаў хоць адбаўляй. А вы хіба не чулі пра наш калгас імя Першага Мая? Аб ім, напэўна, ведае ўся вобласць.

Заява калгаснага рахункавода Аляксандра Ліпніцкага супакойліва падзейнічала на прысутных. Усе замоўклі. Падышоўшы да стала, рахункавод моцна паціснуў руку загадчыку райза, а затым уручыў яму паперу. Пакуль Шведаў чытаў паперу, рахункавод безупынна гаварыў:

— Неадкладная справа. Дошкі патрэбны. Сказалі: у калгас не вяртайся без дошак. Мы-ж абяцалі лазню да першага чысла пабудаваць, а сёння чацвертае. Усё гатова, з падлога затрымліваецца.

Атрымаўшы дазвол на атрыманне дошак, Ліпніцкі, накіроўваючыся да выхаду, заявіў:

— Дзён праз чатыры—пяць і вы прыходзьце ў лазню!

З гордасцю вышаў з кабінета. Калі рахункавод схаваўся за дзвярыма, загадчык райза працягваў размову:

— Вось бачыце—як жывуць калгаснікі з калгаса імя Першага Мая. Арганізаваліся яны зусім нядаўна. А цяпер іх не пазнаць. Калектыўная праца зрадніла іх. За калгасам навечна замацавана 300 гектараў зямлі. Былыя батракі і беднякі зажылі заможна і радасна. Калгаснікі паспяхова спраўляюцца з работай. Нядаўна яны па сваёй ініцыятыве рашылі пабудаваць першую ў [illegible] лазню. Райвыканком адобрыў ініцыятыву і рашыў у 1941 годзе пабудаваць ва ўсіх сельсоветах і калгасах 20 грамадскіх лазняў. А паглядзіце іх гаспадарку, іх жыццё—душа радуецца.

Сяляне ўважліва слухаюць загадчыка райза. Яны нават забыліся пра спрэчку.

Каля зямельнага аддзела, даўшы некалькі сігналаў, спыніўся грузавік. Шведаву трэба было ехаць у калгас. І вось ён падымаецца з-за стала, звяртаецца да прысутных:

— Аб зямлі на месцы вырашым пытанне, а зараз паедзем, калі хочаце, паглядзім, як жывуць калгаснікі.

Праз некалькі мінут поўны грузавік накіраваўся да калгаса. Машына хутка ўзлящела на ўзвышша. Адсюль адкрываўся від на калгасную сядзібу. І вось машына спынілася ля праўлення калгаса. Прыехаўшых сустрэла дэпутат абласнога Совета Хэлена Адамаўна Літман, былая батрачка пана Тышкевіча, зараз знатная стаханаўка ў калгасе. За год калгаснага жыцця Хэлену не пазнаць. Яна культурна і палітычна вырасла.

Завязалася шчырая гутарка. Падышоў старшыня калгаса Канстанцін Браткоўскі. Даведаўшыся аб прычыне прыезду гасцей, ён адразу-ж прапанаваў пайсці і аглядзець калгасную гаспадарку. Пачалі з жывёлагадоўчай фермы. 27 кароў добрай [illegible] стаялі ва ўтульным памяшканні. Чыстата здзівіла прыехаўшых, калі яны аглядалі цялятнік і свінарнік. Адсюль яны пайшлі ў грамадскія свірны, любаваліся вялікім будынкам лазні.

Затым гасцей запрасілі ў кантору. Час быў ужо позні. Вечарэла. Ясінаўскіх сялян запрасілі на абед. Іх завялі ў першую трапіўшую хату калгасніка Станіслава Аншчака.

— Нічога, нічога, заходзьце, — сустрэла гасцей гаспадыня дома Станіслава Адамаўна. — Не думайце, што вы нас будзеце сцясняць. Будзе чым сустрэць паважаных гасцей, досыць у нас усяго добрага. У калгасе мы атрымалі 340 пудоў хлеба і столькі-ж бульбы.

Усе паселі за стол. Падаючы на стол страву, гаварлівая гаспадыня працягвала:

— К таму-ж я нядаўна атрымала ад дзяржавы 2.000 рублёў. Хлеба-ж у нас годы на тры хопіць. Ды малачко ў нас сваё, і свінню нядаўна закалолі.

Тут ясінаўскі селянін Зарэцкі не вытрымаў, спытаў:

— А колькі ў вас даюць на працадзень?

Брыгадзір калгаса Осіп Аншчак тут-жа адказаў:

— Не мала, не многа, а кожны працадзень важыць 5 кілаграмаў зярна і 5 кілаграмаў бульбы, ды каля рубля грашыма.

Затым тав. Аншчак [illegible] сваё паляводства. Сярэдні ўраджай у калгасе саставіў: жыта 12 цэнтнераў з гектара, аўсу — 12 цэнтнераў, ячменю — 11 цэнтнераў, пшаніцы — 12 цэнтнераў і бульбы па 200 цэнтнераў. Увосень усе палі ўзараны пад зябліва, для ўгнаення вывезена 500 тон гною.

На абедзе прысутнічала калгасніца Марыя Ліпніцкая. З гордасцю расказвала яна аб рабоце жанчын-стаханавак, аб тым, што калгаснае жыццё прынесла ім многа выгод. Сама яна асабіста на свае працадні атрымала амаль 100 пудоў зярна. Такую-ж колькасць атрымала хлеба лепшая калгасніца Юзэфа Кабешка.

Нарэшце, маладая калгасніца Юзэфа Аншчак паведаміла, што ў будучым годзе па ініцыятыве моладзі ў калгасе будзе пабудаван клуб. Развядуць парніковую гаспадарку і зробяць пруд.

Толькі позна ўночы ясінаўцы ад'язджалі з калгаса. Калі госці сядзелі ўжо на машыне, загадчык райза тав. Шведаў звярнуўся да братоў Лубенскіх:

— А з зямлёй мы на месцы разбяромся!...

Але братам было ўжо не да таго. Кожны з іх быў ахоплен новымі думкамі. Бацькоўская зямля ў іх адышла на задні план.

В. Гарбанёў.

[illegible] калгас імя Першага Мая, [illegible] раёна

[illegible]коў [illegible]ва- [illegible] паступілі

Абвяржэнне ТАСС

Шанхайскі карэспандэнт «Нью-Йорк таймс» сцвярджае, што кітайская армія атрымлівае праз Уладзівасток вялікую колькасць ваенных матэрыялаў, медыкаментаў і іншага забеспячэння і што амерыканскі ваенны афіцэр Карлсон у бліжэйшы час накіруецца ў Уладзівасток, каб паскорыць адпраўку ваенных матэрыялаў у Кітай.

ТАСС упаўнаважан абвергнуць гэта паведамленне, як выдуманае з пачатку да канца.

—о—

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

НЬЮ-ЙОРК, 23 снежня. (ТАСС). Як перадае амерыканскі друк, у прыўзбярэжным сектары грэчаскія войскі занялі вёску Польяна, у 4 мілях ад Враніcці; у сектары ракі Таморыца імі захоплена горная вёсачка Ромасі; у сектары Грамш—вёска Тэрволі. У сектары Клісуры грэчаскія часці цясняць адступаючых італьянцаў уздоўж даліны ракі Дзесніца па напрамку да вёскі Бубесі. У раёне Тэпелене грэкі прасунуліся на адну мілю ў гарах Грыба.

Італьянцы ўжо пакінулі Клісуру. Сражэнне адбываецца ля размешчаных паблізу ўзгоркаў. Грэкі атакуюць італьянцаў з трох бакоў.

Грэчаскія войскі занялі некалькі новых пазіцый у сектары Клісуры—Тэпелене, а таксама ў прыўзбярэжным раёне, дзе італьянскія часці, атрымаўшы падмацаванні, аказваюць моцнае супраціўленне.

Італьянскія абарончыя лініі ў прыўзбярэжным сектары вакол Хімары прарваны. Італьянцы адступаюць на поўнач, імкнучыся ўстанавіць новыя абарончыя лініі ля Валоны.

БЕЛГРАД, 23 снежня. (ТАСС). Югаслаўская газета «Правда» паведамляе, што грэчаскія бамбардыроўшчыкі двойчы бамбардыравалі гарады Чукут, Проярос і Галіч, дзе былі сканцэнтрыраваны італьянскія мотадывізіі. Бамбардыроўцы падпалі таксама ваенныя аб'екты ў тылу італьянцаў.

—о—

ЗВОДКА ІТАЛЬЯНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

РЫМ, 23 снежня. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае наступную зводку італьянскага камандавання: «У прыгранічнай паласе Кірэнаікі становішча без перамен. Адноўлена бамбардыроўка адной з перадавых баз праціўніка; рабіліся атакі непрыяцельскіх бронетанкавых часцей. Італьянскі самалёт-тарпеданосец патапіў адзін англійскі дапаможны крэйсер.

На грэчаскім фронце атакі праціўніка былі адбіты. Італьянскія войскі нанеслі праціўніку значныя страты і захапілі аўтаматычную зброю. Злучэнні італьянскай знішчальнай авіяцыі ўступілі ў бой з 9 англійскімі самалётамі тыпу «Бленхейм» і збілі з іх тры самалёты.

Ва Ўсходняй Афрыцы італьянская авіяцыя бамбардыравала ваенныя збудаванні і мотамеханізіраваныя часці праціўніка ў Англа-Егіпецкім Судане. У ноч на 22 снежня англійскія самалёты зрабілі налёт на Італію і скінулі бомбы ў лагуну Венецыі, не прычыніўшы ні афяр, ні пашкоджанняў».

Прамова прэзідэнта Руці

ХЕЛЬСІНКІ, 22 снежня. (ТАСС). Учора ў 12 гадзін Руці выступіў з прамовай перад сеймам, у якой ён сказаў:

— Я, Рысто Руці, выбраны фінскім народам прэзідэнтам Фінляндскай рэспублікі, гэтым засведчаю, што я, знаходзячыся на пасту прэзідэнта, буду шчыра і аддана захоўваць законы дзяржаўнай канстытуцыі і ўсімі сродкамі садзейнічаць поспехам фінскага народа. Пасля выбараў прэзідэнта, праведзеных на аснове закона, і пасля ўрачыстай прысягі я абавязуюся прыступіць да выканання цяжкіх і адказных абавязкаў прэзідэнта.

Далей Руці ўказаў на заслугі памёршага прэзідэнта Каліо і адзначыў, што Каліо заўсёды з усведамленнем адказнасці выконваў свой доўг. Нават пры нармальных жыццёвых умовах, працягваў Руці, дзейнасць прэзідэнта з'яўляецца цяжкай і адказнай. Але яна асабліва цяжкая і адказная цяпер, калі прыходзіцца напружваць усе намаганні для перамагання небяспек і цяжкасцей. Я адчуваю гэтыя цяжкасці першага слугі народа. Адзінае, што я магу абяцаць і гарантаваць, гэта шчыра імкнуцца да таго, каб накіраваць сваю дзейнасць на дабро народа і радзімы. Таго-ж я чакаю ад усіх грамадзян, незалежна ад іх становішча ў грамадстве.

Указаўшы, што важнейшай задачай з'яўляецца захаванне незалежнасці краіны і што ў мэтах забеспячэння безапаснасці Фінляндыі неабходна ўмацоўваць яе абарону, Руці заявіў:

— Мы хочам і адчуваем патрэбу ў захаванні спакою нашага жыцця, каб мець магчымасць як мага хутчэй і больш паспяхова аднавіць разбурэнні, прычыненыя вайной. Карэлы, якія з гатоўнасцю нясуць цяжкасць лёсу і якія спакойна і цярпліва прыстасаваліся да цяжкіх умоў, павінны быць як мага хутчэй пастаўлены на ногі. Яны павінны стаць самастойнымі будаўнікамі дзяржавы, карыснымі і задаволенымі грамадзянамі. Пачатая плённая работа павінна быць закончана. Вытворчасць, у асаблівасці вытворчасць прадуктаў харчавання, трэба пашырыць, каб існаванне нашага народа было забяспечана і неабходныя жыццёвыя ўмовы былі-б упаўне дастатковымі. У нас не будзе недахопу ў працы для ўсяго народа, ніводнаму працаздольнаму няма падставы адмаўляцца ад працы. Фінскі народ жадае быць у баку ад вайны і, захоўваючы нейтралітэт, шчыра жадае звароту ўсеагульнага міру і безапаснасці, каб з усёй сілай прыняць удзел у аднаўленні Еўропы, робячы абмен прадуктамі вытворчасці нацыянальнай прамысловасці на тавары, неабходныя для ўнутранага спажывання.

Фінскі народ імкнецца падтрымліваць і развіваць добрыя і шчырыя адносіны з усімі блізкімі і аддалёнымі народамі. Асабліва яму хочацца ўстанавіць дружаственыя і добрасуседскія адносіны з СССР і развіць іх на глебе дагаворанасці і ўзаемнага давер'я. Такім-жа чынам ён хоча і ў далейшым умацоўваць і паглыбляць дружаственыя адносіны з Германіяй, з якой у яго ёсць гістарычныя, эканамічныя і культурныя пункты судатыкання. Яго дружаственыя адносіны да Швецыі грунтуюцца на векавых узаемных традыцыях, на аднолькавым разуменні справядлівасці і на жаданні захоўваць нейтралітэт.

У заключэнне Руці сказаў:

— Спадзяючыся на вышэйшае кіраўніцтва, я прыступаю да адказнай дзейнасці і ўпэўнен у тым, што жыццездольны народ, у перыяд сваёй мінулай гісторыі заўсёды спраўляўшыйся з усімі цяжкасцямі і небяспекамі, можа і цяпер дасягнуць лепшых умоў жыцця. Па маёй думцы, гэта лепш усяго можа быць дасягнута на выпрабаванай і моцнай глебе сумеснай працы ў парламенце. Кожны, акрамя таго, з свайго боку будзе шчыра дабівацца поспеху ў будаўніцтве больш моцнага грамадства і дзяржавы. Дзякую вам, пан старшыня, за дружаскія словы і прывітальныя пажаданні. Жадаю сейму поўнага поспеху.

Уцёкі Рыдз-Смiглы

БЕРЛІН, 22 снежня. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, афіцыяльна падцвярджаецца, што маршал Рыдз-Смiглы, які ўцёк у Румынію ў верасні 1939 года і быў інтэрніраван некалькі месяцаў таму назад румынскім урадам у замку недалёка ад Кымпулунг, уцёк адтуль два дні таму назад.

Рыдз-Смiглы было дазволена рабіць раніцамі прагулку, у час якой ён знаходзіўся пад аховай румынскіх паліцэйскіх. 18 снежня раніцой у час прагулкі да Рыдз-Смiглы пад'ехаў аўтамабіль і раней, чым паліцэйскія паспелі ўмяшацца, Рыдз-Смiглы сеў у аўтамабіль, які хутка ўдаліўся.

Неадкладна былі папярэджаны ўсе паліцэйскія пасты і было арганізавана праследванне. Аднак аўтамабіль не быў выяўлен. Мяркуюць, што Рыдз-Смiглы або ўдалося дасягнуць граніцы і выехаць з Румыніі, або ён накіраваўся ў Бухарэст, дзе знайшоў сабе тайнае сховішча.

У румынскіх палітычных кругах лічаць, заяўляе Германскае інфармацыйнае бюро, што калі гэта апошняе меркаванне правільнае, то, магчыма, што Рыдз-Смiглы схован англійскімі кругамі Бухарэста ці англічанамі, якія маюць амерыканскія пашпарты. Румынскі ўрад загадаў зрабіць строгае расследванне. Паліцэйскія, вінаватыя ў недастатковым наглядзе за інтэрніраваным, арыштаваны. Апрача таго, папярэджаны ўсе пагранічныя пасты, а ў Бухарэсце ўстаноўлен строгі нагляд за асобамі, якія могуць быць западазроны ў суўдзеле.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе таксама, што былы польскі міністр замежных спраў Бек пасля няўдалай спробы да бегства інтэрніраван у адным з прыватных дамоў Бухарэста і знаходзіцца пад строгім наглядам.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 23 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: учора ўдзень дзейнасць германскай авіяцыі абмяжоўвалася разведчымі палётамі. Адзін разведчы самалёт бамбардыраваў з брыючага палёту буйнейшы англійскі алюмініевы завод Форт Вільям у Паўночнай Шатландыі. Прамымі пападаннямі заводу нанесены сур'ёзныя пашкоджанні.

У ноч на 23 снежня буйныя злучэнні германскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў падверглі паспяховай бамбардыроўцы важныя прамысловыя збудаванні ў Манчэстэры. На заводах і складах узніклі велізарныя пажары. Бамбардыроўцы падпалі таксама важныя ў ваенных адносінах аб'екты Лондана, Брыстоля, Ліверпуля, Саутгемптана, Портсмута і іншых гарадоў.

Англійскія самалёты скінулі ў ноч на 23 снежня невялікую колькасць бомб у некаторых месцах заходняй пагранічнай вобласці Германіі. Нанесен нязначны ўрон дамам. Ёсць раненыя. У баі збіт адзін непрыяцельскі самалёт; адзін германскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 23 снежня. (ТАСС). Па афіцыяльнаму паведамленню, учора на досвітку самалёт праціўніка скінуў некалькі бомб на адзін з пунктаў Заходняй Шатландыі. Бамбардыроўка прычыніла нязначны ўрон. Удзень германская авіяцыя не праяўляла над Англіяй ніякай актыўнасці.

У ноч на 23 снежня былі скінуты бомбы галоўным чынам на адзін з гарадоў Паўночна-Заходняй Англіі. Налёт на гэты горад насіў жорсткі характар і працягваўся некалькі гадзін. У горадзе ўспыхнула многа пажараў, якія прычынілі сур'ёзныя пашкоджанні рознастайным будынкам і гандлёвым прадпрыемствам. Дакладных звестак аб афярах пакуль няма.

Уночы было збіта два германскіх бамбардыроўшчыкі.

Англійская авіяцыя зрабіла ў ноч на 23 снежня новы налёт на ваенныя аб'екты Заходняй Германіі, у тым ліку на Мангейм.

Як перадае агенцтва Рэйтэр, учора на досвітку англійская авіяцыя берагавой абароны зрабіла налёт на марскую базу Вільгельмсгафен у Германіі і германскія базы ў Брэсце і Лорыяне.

—о—

АСОШЫЭЙТЭД ПРЭС АБ ЗАНЯЦЦІ ГРЭКАМІ ХІМАРЫ

НЬЮ-ЙОРК, 23 снежня. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што грэкі, захапіўшы Хімару, узялі ў палон 30 італьянскіх афіцэраў, 800 салдат і многа ўзбраення. Грэчаская матарызаваная калона праследуе італьянцаў, якія адступаюць да Валоны.

ВАЙНА Ў АФРЫЦЫ

ЛОНДАН, 23 снежня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што 35.949 палонных італьянцаў, уключаючы 1.704 афіцэры, эвакуіраваны з раёна Сідзі-Барані. У прыфрантавых лагерах яшчэ некалькі тысяч палонных чакаюць эвакуацыі.



Ваенізіраваны паход беластоцкай моладзі 22 снежня 1940 г.
На здымку: жаночая калона студэнтаў педінстытута ў паходзе.
Фота А. Сапіра.

ПЕШЫ ВАЕНІЗІРАВАНЫ ПЕРАХОД КОМСАМОЛЬЦАЎ І НЕСАЮЗНАЙ МОЛАДЗІ

Марш баявой маладосці

Яшчэ гарэлі вулічныя ліхтары і няскора настала світанне, а з усіх канцоў горада маладыя юнакі і дзяўчаты спяшаліся да сваіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Від іх незвычайны—лёгка апранутыя, з процівагазамі праз плечы. Від урачыста-прыўзняты, баявы і імклівы.

На ўсебеларускі ваенізіраваны паход комсамольцаў разам з несаюзнай моладдзю вышлі ткачы і чыгуначнікі, металісты і сувязісты, студэнты і вучні сярэдніх школ, работнікі гандлю і служачыя ўстаноў Беластока. К 10 гадзінам да стадыёна «Дынама» сабралося да 2 тысяч чалавек, якія чакалі адпраўлення ў паход. У 10 гадзін 20 мінут першай атрымала старт каманда міліцэйскіх работнікаў, за імі пайшлі чыгуначнікі, студэнты, члены прамысловых арцелей, хлопцы і дзяўчаты.

Энтузіязм удзельнікаў паходу невыказна вялікі, маладыя парыў сапраўды нястрымны. І трэба было бачыць, з якім захапленнем адпраўляліся каманды па сваіх маршрутах, як строга і сур'ёзна перадольвалі кіламетравую «заражаную» зону, пераходзячы яе ў працівагазах. Мужчынскія каманды атрымлівалі 15-кіламетравыя, а жаночыя 7-кіламетравыя маршруты як важнейшае заданне, і кожны ўдзельнік каманды поглядам акідваў таварыша: «ці вытрымае ён таго тэмпа, з якім буду старацца ісці я, каб прайсці хутчэй, каб не падвесці каманду». Дух спаборніцтва захапляў, надаваў сілы і напорыстасці.

Вось на старце мужчынская каманда членаў прамысловай арцелі «Керамік». Узмах флажка, і кіраўнік каманды Мар'ян Вальневіч дае каманду: «За мной, крокам марш!». Каманда дружна змагалася за кожны кіламетр, абагнала ў дарозе некалькі іншых каманд, некалькі кіламетраў прайшла бягом і паказала самы лепшы рэзультат: 15 кіламетраў за 1 гадзіну 21 мінуту. Другое месца заняла каманда дывізіёна наружнай службы міліцыі, паказаўшы час 1 гадзіну 27 мінут. Трэцяе месца ўзяла каманда 6-га камбіната пад кіраўніцтвам комуніста Арсеньева. Яе час—1 г. 32 мін.

Сярод дзяўчат лепшыя паказчыкі далі дзве каманды ўпраўлення Беластоцкай чыгункі: каманда № 295, якая прайшла свой маршрут 7 кіламетраў за 59 мінут 27 секунд, і каманда № 80 пад кіраўніцтвам комсамолкі Петрышынай—1 гадзіну 40 секунд. Трэцяе месца належыць жаночай камандзе 2-га скурзавода, якая паказала час 1 г. 55 сек.

Адразу-ж пасля фініша ўдзельнікі паходу накіроўваліся на стадыён і выконвалі задачу па гранатаметанню: паражэнне акопа праціўніка.

Найбольшая колькасць удзельнікаў паходу была ад абласнога саюза промкааперацыі, які выставіў 20 каманд. 13 каманд дала чыгунка, 12—педінстытут. Усяго прышлі к фінішу з выкананнем усіх патрабаванняў пераходу 176 каманд, з іх 56 жаночых. Кожная каманда мела па 10 чалавек. Да ўдзелу ў паходзе з'явілася больш двух з паловай тысяч чалавек, але з прычыны дрэннай падрыхтоўкі адны не былі допушчаны на старт, другія зблыталі маршруты і не фінішыравалі.

Паход паказаў гарачае жаданне моладзі займацца ваенна-фізкультурнай справай, гэта быў сапраўдны марш баявой маладосці, паказчык гатоўнасці маладых патрыётаў у любы час стаць на абарону совецкай радзімы. Адначасова-ж гэты паход з'явіўся для нашых комсамольскіх і фізкультурных арганізацый урокам таго, як старанна і прадумана трэба рыхтаваць масавыя ваенна-фізкультурныя мерапрыемствы.

І. Клінаў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

25 снежня 1940 года, у 8 гадзін вечара, у Доме партыйнай асветы адбудзецца лекцыя на тэму: «Аб рабоце Энгельса—«Людвіг Фейербах». Лекцыю чытае лектар ЦК КП(б)Б тав. Ажгірэй.

Білеты прадаюцца ў Доме партыйнай асветы (вуліца Талстога,9).

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партыйнага — [illegible] камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.